**УДК 793.2:355.665.2(476.2)**

# ВЯСЕЛЬНЫЯ ЖАНОЧЫЯ ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ І ПРЫЧОСКІ УСХОДНЯГА ПАЛЕССЯ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

## (ЖАНОЧЫЯ ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ І ПРЫЧОСКІ Ў НАРОДНЫХ СВЯТАХ, АБРАДАХ І ЗВЫЧАЯХ)

***А.М. РАМАНЮК***
***(Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Мінск)***

*Даследуюцца вясельныя галаўныя ўборы – асобная група жаночых галаўных убораў, якая мае свае спецыфічныя прыкметы семіятычнага, архетыпічнага, дэкаратыўнага і этнічнага зместу. Гэта раскрываецца ў самой форме галаўных убораў і іх аздабленні, момантах нашэння падчас падрыхтоўкі і правядзення вяселля, асаблівасцях распаўсюджанасці. Вядома, што людзі са старажытных часоў надавалі валасам сімвалічнае значэнне і верылі ў іх магічную сілу. Прычоска мела асаблівае значэнне ў вясельным абрадзе. Спосаб пляцення касы і яе выгляд мог сведчыць аб сацыяльным і сямейным становішчы жанчыны. Паводле ўяўленняў сялян, менавіта нашэнне галаўнога ўбору, які закрываў валасы замужняй жанчыны, спрыяла дабрабыту ў гаспадарцы і сямейнаму шчасцю. Паказана, што комплексы адзення маюць адрозненні ў залежнасці ад рэгіёну панавання. Даследаванне абрадавых галаўных убораў і прычосак дазваляе сцвярджаць, што варыянты галаўных убораў і роля, якая ім адводзілася ў абрадзе, таксама розніліся ў залежнасці ад замацаваных у пэўным рэгіёне традыцый. Абрадавае адзенне палешукоў адрозніваецца надзвычайнай арыгінальнасцю і лакальнай разнастайнасцю.*

**Уводзіны.** Галаўны ўбор і прычоска адыгрывалі найважнейшую ролю ў вясельным абрадзе. Традыцыя ўсталёўвала пэўныя нормы падрыхтоўкі і нашэння валасоў і галаўных убораў, парушэнне якіх, паводле вераванняў народа, прыносіла няшчасце. Вывучэнне абрадавых галаўных убораў дазволіла выявіць, што для жанчын ствараліся асаблівыя галаўныя ўборы і прычоскі. Для мужчын як выканаўцаў абрадаў або як удзельнікаў народная традыцыя канца XIX – пачатку XX стагоддзя не прадугледжвала такой строгай рэгламентацыі нашэння галаўнога ўбору.

Першапачатковая сімволіка касцюма, як і сэнс абрадаў, з цягам часу забывалася і змянялася, але сама традыцыя, занатаваная ў народнай памяці, захоўвалася на працягу некалькіх пакаленняў. Перапляценне хрысціянскіх і народных традыцый і звычаяў у беларускім вясельным абрадзе, стала жыватворнай глебай для стварэння унікальных галаўных убораў.

**Асноўная частка.** Абрадавыя галаўныя ўборы і прычоскі дагэтуль не разглядаліся як самастойная тэма і застаюцца недасканала вывучанымі. Многія навукоўцы, а менавіта Г. Маслава, Д. Зяленін, М. Раманюк падкрэслівалі асаблівую ролю галаўных убораў у народных звычаях і абрадах. Вядома, што валасы і галаўныя ўборы заключалі ў сабе магічную і апатрапейную функцыю, а таксама маркіравалі непасрэдных удзельнікаў рытуалаў. Вялікі аб'ём інфармацыі раскрываюць манаграфіі, навуковыя артыкулы і калекцыя фотаздымкаў айчыннага даследчыка М. Раманюка. Намі прыводзяцца запісы з яго матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны, Жлобінскі, Акцябрскі, Брагінскі, Хойніцкі раёны[1], а таксама фотаздымкі з прыватнага архіва М. Раманюка.

Вялікая колькасць даследаванняў прысвечаная вывучэнню вясельнага абраду і адзення ўсходніх славян. Найбольш значнымі сярод іх з'яўляюцца «Происхождение и история белорусской свадебной обрядности» М. Нікольскага [1], у якой даследуецца паходжанне і бытаванне вясельнай традыцыі ва ўсходніх славян, «Женские головные уборы восточных (русских) славян» Д. Зяленіна [2], «Етнокультурні зв'язки украінців та біловусів Полисся. На матеріалах весільноі обрядовості» Г. Пашковай [3]. У кнізе «Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX – начала XX в.» Г. Маслава падрабязна разглядае і апісвае этапы вясельнага абраду беларусаў, украінцаў і рускіх, і сімвалічную ролю адзення ў іх [4]. Некаторыя высновы даследчыцы паслужылі разуменню ролі прычоскі і галаўных убораў у вясельным абрадзе, але пададзеныя ёй звесткі былі не дастаткова сістэматызаваныя.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на Беларусі найбольш актыўна спраўляліся абрады каляндарнага і сямейнага цыклаў, у якіх галаўныя ўборы займалі выразнае фунцыянальнае і сімвалічнае значэнне. Сярод абрадаў сямейнага цыклу вяселле з'яўляецца паўсюдна распаўсюджаным народным святам,

[1] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны (1990, 1991 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка.
Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Брагінскі, Хойніцкі раёны (1969, 1971, 1973 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка.
Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі, Жлобінскі, Акцябрскі раёны (1973, 1974, 1975, 1977, 1980 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка.

найбольш цікавым і складаным для вывучэння. З усіх народных святаў, яно найлепш захавалася ажно да XX стагоддзя, хаця б і значна трансфармавалася ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя з развіццём сучаснай гарадской культуры. Такім чынам, вяселле – абрад, які да сённяшняга дня ўплывае і шмат у чым фарміруе сучасную вясельную традыцыю.

Вяселле спраўлялася па пэўным сцэнары, у якім прысутнічаў шэраг абавязковых выканаўцаў абрадаў і рытуальныя атрыбуты, найперш галаўныя ўборы. Роля і статус удзельнікаў вяселля, як звычай, абазначаліся з дапамогай спецыяльных касцюмаў або адмысловага іх аздаблення. Так, касцюмы маладой, маладога, свахі, сватоў і дружак адрозніваліся ад касцюмаў іншых галаўнымі ўборамі, надзвычайнай святочнасцю і ўпрыгожваліся ручнікамі, стужкамі, кветкамі і іншым чынам. Галаўны ўбор быў асноўным элементам вясельнага касцюма маладой. Ён з’яўляўся неад’емным атрыбутам вяселля, гэткім жа, як пасаг або ручнік. Галаўны ўбор існаваў у цеснай сувязі з прычоскай. Валасам з даўніх часоў надавалася вялікае магічнае значэнне. У вясельным абрадзе за спосабам нашэння і ўпарадкавання валасоў былі замацаваныя пэўныя старажытныя ўяўленні, вераванні, рытуальныя дзеянні і звычаі. Прычоска маладой змянялася некалькі разоў на працягу вяселля. Змена прычоскі і галаўнога ўбору сімвалізавала замацаванне ўлады мужа, падпарадкаванне жонкі яму і ягонай сям’і, і азначала паэтапны пераход жанчыны ў род мужа. Таксама перамена прычоскі і збіранне валасоў пад галаўны ўбор сведчылі аб пераходзе дзяўчыны ў новы статус замужняй жанчыны.

Для таго каб уявіць сімвалічнае значэнне валасоў у вясельным абрадзе, неабходна вылучыць асноўныя абрадавыя дзеянні, якія выконваліся падчас вяселля і былі звязаныя з валасамі і пераменай прычоскі. Абрадавых дзеянняў звязаных з валасамі шмат, назавем асноўныя, якія найлепш захавалі сваё значэнне і бытаванне напрацягу канца XIX – пачатку XX стагоддзя:

- падстрыганне валасоў, якое замяніла больш стражытнае падпальванне валасоў;
- расчэсванне валасоў;
- заплятанне касы і ўплятанне ў яе розных элементаў магічнага і дэкаратыўнага значэння (стужак і апатрапейных раслін);
- расплятанне касы і развітанне з ёй;
- продаж і выкуп касы.

На Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя былі вядомыя дзве асноўныя дзявочыя прычоскі – распушчаныя валасы і валасы, заплеценыя ў касу. Распушчаныя валасы насілі па святах і падчас выканання асаблівых абрадаў. Вясельнай прычоскай маладой была каса. Падчас вяселля дзяўчыне спачатку распускалі і расчэсвалі валасы, і толькі пасля гэтага заплятали адну або некалькі кос.

На Усходнім Палессі было распаўсюджана некалькі варыянтаў заплятання валасоў – у дзве касы, у адну касу, у не да канца заплеценую або напалову распушчаную касу. Плесці пачыналі з патыліцы. Валасы пры гэтым расчэсвалі розным чынам: гладка, на прабор або рабілі “начосы”[2]. Прычоска з расчасанымі на прабор валасамі мела лакальныя назвы: «на роўчэк» (Лунінецкі р-н), «на продзел» (Жыткавіцкі р-н), «на радок» (Столінскі р-н).

Вясельную касу аздаблялі асаблівым чынам. У яе ўплятали каснікі, купленыя шаўковыя стужкі сіняга, чырвонага, зялёнага колераў, натуральныя і штучныя кветкі. Спосабы ўпрыгожвання прычоскі вар’іраваліся ад аздаблення касы па ўсёй даўжыні, да аздаблення канцоў, сярэдзіны або пачатку.

Існаваў звычай уплятаць у вясельную касу расліны, якія мелі сімвалічнае, апатрапейнае значэнне – мяту, валошкі, часнок, лён, салому, каласы. Паводле запісаў М. Раманюка, косы дзялілі на дзве часткі, і ўплятали ў іх палойкі лёну, называлі такую прычоску «галава як гумно»[3]. Асацыяцыя прычоскі з гумном выяўляе ідэю пладнасці, звязаную з валасамі ў народнай свядомасці.

За спосабамі заплятання валасоў замацавалася маркіравальная функцыя прычоскі як паказчыка сямейнага становішча жанчыны. Існаваў шэраг прыкмет і звычаяў, паводле якіх каса павінная была заплятацца пэўным чынам. З дапамогай асаблівага пляцення або аздаблення валасоў імкнуліся перадаць радавую гісторыю маладой, яе сямейны статус у бацькоўскім доме, грамадскае і сацыяльнае становішча. Напрыклад, калі ў нявесты былі бацькі, тады на вянчанне ёй заплятали косы. Калі ж яна была сіратой, то распускалі валасы[4]. На жаль, вельмі складана вылучыць устойлівыя традыцыі нашэння адной ці дзвюх кос у пэўных рэгіёнах у залежнасці ад выпадку. Гэта звязана з тым, што ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя нават у суседніх вёсках прычоска, яе варыянты і іх вытлумачэнне маглі моцна розніцца.

---

[2] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны (1990, 1991 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка.

[3] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Брагінскі, Хойніцкі раёны (1969, 1971, 1973 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка. – С. 21.

[4] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі, Жлобінскі, Акцябрскі раёны (1973, 1974, 1975, 1977, 1980 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка. – С. 47.

У народзе касу называлі «дзявочай красой». Каса была не толькі сродкам прываблівання мужчын. Яе адкрытае нашэнне сімвалізавала цнатлівасць дзяўчыны. У народнай свядомасці каса асацыіравалася з дзявоцтвам, вольным ад сур'ёзных абавязкаў жыццём у бацькоўскім доме, аб чым спяваецца ў многіх народных песнях. Абрад расплятання касы, паводле розных крыніц, адбываўся да вянчання, або пасля яго, і суправаджаўся рытуальнымі дзеяннямі. Падчас расплятання маладую саджалі на дзяжу, пакрытую вывернутым кажухом. М. Нікольскі прыйшоў да слушнай высновы, што выкарыстанне кажуха з'яўляецца рэшткай татэмістычнага культу, а таксама сімвалізуе багацце і дабрабыт [1].

Ва ўсіх усходнеславянскіх народаў у той або іншай форме праводзіліся абрады продажу і выкупу касы. Паводле меркаванняў Г. Маславай, выкуп касы нібыта зліваўся з «продажам» [4]. Звесткі аб існаванні гэтых звычаяў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя трапляюцца на Усходнім Палессі.

Яшчэ адным значным момантам вяселля было падстрыганне валасоў. Аб паходжанні і значэнні абрадаў расчэсвання, падстрыгання і падпальвання валасоў выказвалі меркаванні даследчыкі М. Запольскі, М. Нікольскі, Г. Маслава. Сёння прычоска мае выключна практычнае значэнне, якое спрыяе рэалізацыі эстэтычных уяўленняў і этычных нормаў, прынятых у грамадстве, а таксама служыць увасабленню ідэала прыгажосці. Расчэсванне ж падчас вяселля ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя, апроч пералічаных функцый, несла сімвалічнае значэнне.

Усе пералічаныя рытуальныя дзеянні з валасамі сумяшчалі магічную і практычную функцыі, што, напэўна, і паслужыла іх захаванню. Таксама трэба адзначыць, што дамінаванне пэўных абрадаў вызначалася рэгіёнам іх панавання. Гэтаксама этнаграфічны арыял прадвызначаў форму і рытуальны змест прычоскі і галаўнога ўбору. Ва ўсіх рэгіёнах у комплексе вясельнага строю існавала асаблівая рэгіянальная форма чапца, наміткі і вянка, таксама як і адметныя традыцыя іх нашэння. На жаль, не бачыцца магчымым у адным артыкуле ахапіць усе віды вясельных галаўных убораў і апісаць на прыкладах рэгіянальную спецыфіку іх вырабу і нашэння. Таму абмяжуемся самымі яркімі і сэнсавызначальнымі прыкладамі.

**Вясельны вянок** меў форму абруча або кароны. Часцей за ўсё яго выраблялі на цвёрдай аснове, абцягваючы палатном і аздабляючы кавалкамі яркіх тканін, пер'ем, папяровымі кветкамі, доўгімі каляровымі стужкамі, якія пускаліся па спіне. Вядома, што вянок маглі выраблять уласна з кветак, як са штучных, так і з жывых. Сам рытуал падрыхтоўкі да пляцення вянка звязваўся з прадметамі, якія мелі апатрапейнае значэнне – нож, замок і г.д., а таксама вытворчае значэнне – каласы, грошы, якія таксама маглі ўплятаць у вянок [4, с. 54]. Гэта сведчыць аб глыбокіх старажытных вераваннях, звязаных з нашэннем гэтага дзявочага галаўнога ўбору. Традыцыйны вясельны вянок – бадай, адзіны абрадавы галаўны ўбор, які не выходзіў з ужытку напрацягу ўсяго XX стагоддзя, нягледзячы на карэннае змяненне моды, адзення, і самаго ладу жыцця (мал. 1).



Мал. 1. Вясельная пара з в. Цна.
Лунінецкі р-н, 1966 г. Невядомы аўтар. Фота захоўваецца ў архіве М. Раманюка

Пасля разнастайных абрадавых дзеянняў, якія сімвалізавалі развітанне дзяўчыны з дзявоцтвам і бацькоўскай сям'ёй, і злучэнне яе з мужчынам, распачыналася перадача маладой самога сімвала замужжа – чапца, і адбывалася завіванне наміткі. Менавіта ў гэтай частцы вяселля ў поўную сілу ўступаў галаўны ўбор, з яго магічнымі і абярэгавымі ўласцівасцямі. Праз абрады апранання чапца і завівання наміткі дзяўчына перажывала пасвячэнне (ініцыяцыю) у жонку, што азначала пераход у чужы род, род мужа, і падначаленне ягонай уладзе. Пасля вяселля спецыяльныя галаўныя ўборы больш не апраналі, але зберагалі на

смерць або перадавалі ў спадчыну ад маці дачцэ. На Усходнім Палессі найбольш распаўсюджаным варыянтам абрадавай вясельнай наміткі было «завівала» (Лельчыцкі, Брагінскі, Калінкавіцкі, Лунінецкі, Светлагорскі раёны). Самі назвы наміткі раскрываюць прызначэнне ўбору – завіць, увіць, спавіць дзяўчыну – схаваць, закрыць яе галаву, валасы і цела пад ільняным покрывам. Абрад **спавівання або завівання маладой** быў адным з кульмінацыйных момантаў вяселля. У народнай свядомасці менавіта падчас завівання наміткі жанчына пераходзіла ў статус замужняй жанчыны, жонкі мужа. Гэты абрад яшчэ да канца XIX стагоддзя меў большае за вянчанне або рэгістацыю шлюбу значэнне [1, с. 30].

Абярэгавае значэнне вясельнай наміткі праяўляецца ў звычаі закрываць маладую вялікай наміткай, накшталт покрыва. Яна хавала галаву і твар маладой, а таксама ахутвала яе з галавы да ног. Такое покрыва на беларускім Палессі, паводле звестак даследчыцы Г. Пашковай, называлі **«спавівала»**. Даследчыца зафіксавала абрад здымання спавівала з галавы маладой, які здзяйсняў музыка сваім скрыпічным смыком, пасля чаго накідваў яго на свякроў, якая, патанчыўшы з ім, кідала покрыва на печ [3, с. 70]. У гэтым абрадзе бачацца рэшткі старажытных рытуалаў і татэмістычнага культу.

Галаўны ўбор **«завівала»** да 1970-х гадоў найлепш захаваўся ў Калінкавіцкім і Светлагорскім раёнах (мал. 2). Паводле апісанняў М. Раманюка, яно ўяўляла дзве неразрэзаныя наміткі (даўжыня 4,80 м), аздобленыя натыканымі ўзорнымі паскамі вышыўкі і мярэжкай, празрыстай ажурнай вышыўкай (саколенне). Сярэдзінай яго клалі на галаву – адным канцом абвівалі шыю, другі прапускалі паверх. Канцы завівала, папярэдне скручаныя ў трубачку, закладалі ў пазухі каптана. Завівалі завівала так, што адзін канец з вышыўкай закрываў вочы. Каб глядзець, маладая адхіляла яго – «так заўюць, што толькі вочы былі ледзь відаць». Завівала апраналі ў доме маладой, пасля чаго яе везлі да маладога, дзе пад спеў жанчын жаніх адхіляў завівала і правяраў, ці ягоная гэта дзяўчына[5]. Завівала, акрамя галоўнай функцыі – стараннага хавання валасоў маладой падчас вяселля, спрыяла змене сілуэту дзявочага касцюма. Многія жанчыны сцвярджалі, што завівала патрэбным было для таго, каб павялічыць аб'ём грудзей маладой, каб стварыць «здаровыя цыцкі», якія лічыліся прыгожымі. Іх утваралі за кошт скручаных у трубку канцоў завівала, закладзеных за полкі каптана і прышпіленых[6].



Мал. 2. Старая жанчына дэманструе на сабе «завівала».
В. Залатуха, Калінкавіцкі р-н, 1973 г. Фота М. Раманюка

Як бачым, ідэя плоднасці, звязаная са старажытным жаночым архетыпам, знаходзіць увасабленне не толькі ў абрадах, але і ў самой форме галаўных увбораў. Звычай закрываць валасы замужняй жанчыны – вельмі старажытны. Да пачатку XX стагоддзя ён захаваўся толькі месцамі, і менавіта на Палессі. Існуе шмат меркаванняў аб паходжанні і трансфармацыі значэння гэтага звычая. На думку Д. Зяленіна, у яго аснове – уяўленні ўсходнеславянскіх народаў і некаторых іх суседзяў аб тым, што адкрытыя валасы прыносяць няшчасце, неўраджай і інш. У звычаі закрываць валасы ён бачыў рэшткі традыцыі закрывання твару [2, с. 315 – 317]. Не толькі для славян, але і для іншых народаў характэрная старажытная вера ў магічную сілу валасоў.

[5] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны (1990, 1991 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка. – С. 9 – 22.

[6] Раманюк, М.Ф. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Калінкавіцкі, Светлагорскі раёны (1990, 1991 г.) / М.Ф. Раманюк // Прыватны архіў М. Раманюка. – С 34.

Разгледжаныя ў артыкуле вясельныя прычоскі і галаўныя ўборы жанчын канца XIX – пачатку XX стагоддзя паказваюць цесную сувязь адзення з рознымі галінамі духоўнага і матэрыяльнага жыцця народа, а таксама характэрныя перапляценні рэлігійных і магічных уяўленняў беларусаў.

**Заключэнне.** Этнаграфічны і фальклёрны матэрыялы паказваюць, што звычаі нашэння галаўных убораў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя адлюстроўваюць веру беларускага народа ў магію валасоў, якую чалавек імкнуўся падпарадкаваць сваім патрэбам і жаданням – быць здаровым, шчаслівым і пладавітым. Асаблівую ролю ў вясельнай абраднасці адыгрываў абрад расчэсвання валасоў маладой, заплятання і расплятання касы і заключнае апрананне галаўнога ўбору. Абрады перамены прычоскі і галаўнога ўбору вызначалі сам ход вяселля. Яны раскрываюць культурны змест гэтай падзеі, а менавіта яго ментальны і псіхалагічны аспекты. Фактычна, падчас вяселля дзяўчына паэтапна ўступае ў новую жаночую ролю, новы сацыяльны статус і разам з мужам закладае пачатак новай сям'і, роду. Усё гэта адбываецца падчас аплаквання і развітання з дазамужнім станам (непакрытай галавой, распушчанымі валасамі), і дэманстрацыяй прывабнасці, таленавітасці, паслухмянасці дзяўчыны, якія сімвалізаваліся прыгожай касой, цнатлівасцю і здольнасцю да вядзення хатняй гаспадаркі, прыбірання сябе ва ўласнатканае адзенне, нашэнне і завіванне наміткі.

Галаўныя ўборы і прычоскі ў абрадах выконвалі сімвалічную, эстэтычную і практычную функцыі. З іх дапамогай адбывалася маркіраванне ўдзельнікаў вяселля паводле ўзросту, полу і сацыяльна-сямейнага статусу, а таксама здзяйсняліся многія рытуальныя дзеянні. Па іх жа меркавалі аб дазамужнім мінулым дзяўчыны жыхары вёскі і сям'я жаніха. Кожная перамена прычоскі і галаўнога ўбору падчас вяселля была асэнсаваным вясельным абрадам і адбывалася ў прысутнасці роду і аднавяскоўцаў, якія маглі засведчыць здзяйсненне пераходу дзяўчыны са свайго роду ў род мужа і ў стан замужняй жанчыны. Традыцыі нашэння абрадавых галаўных убораў раскрываюць цесную сувязь касцюма, момантаў яго стварэння і нашэння, са светапоглядам народа. Гэта дае магчымасць меркаваць аб разнастайнасці і асэнсаванасці праяў народнага жыцця. У сферы функцыянавання абрадавага касцюма прасочваецца шмат агульнага ў традыцыях і вераваннях не толькі тэрытарыяльна блізкіх нам народаў, але і многіх іншых еўрапейскіх этнасаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Никольский, Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н.М. Никольский. – Минск, 1956. – 274 с.
2. Зеленин, Д.К. Женские головные уборы восточных (русских) славян / Д.К. Зеленин. – Slavia, 1926. – Вып. 2. – 231 с.
3. Пашкова, Г.Т. Етнокультурні зв'язки українців та біловусів Полисся. На матеріалах весільної обрядовості / Г.Т. Пашкова. – Київ, 1978. – 167 с.
4. Маслова, Г.С. Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах IX – начала XX в. / Г.С. Маслова. – М.: Наука, 1984. – 216 с.

*Паступіў 25.09.2009*

## WEDDING WOMEN HEAD DRESS AND HAIR DRESS OF THE EASTERN POLESYE OF THE END OF 19TH – BEGINNING OF THE 20TH CENTURY (WEDDING WOMEN HEAD DRESSES AND HAIR DRESSES IN FOLK FESTS, RITES AND CUSTOMS)

***A. RAMANUK***

*Wedding women head dresses, which are a separate group women head dresses, have their own specific properties of semiotic, archetypical, decorative and ethnical content. This is disclosed in the form of head dresses and their appearance, moments of wearing at the time of preparation for the wedding, peculiarities of their prevalence. It is known that people from the ancient times placed symbolic emphasis to the hair and believed in its magical power. Hair dress had a peculiar meaning for the marriage rite. The way of queuing and its appearance could bear evidence of social and marital status of a woman. According to the beliefs of countrymen namely the head dress which covered the hair of an unmarried woman contributed to wellbeing and family happiness. It is shown that complexes of clothing have differences depending on the region of prevalence. The research of the ceremonial head dresses and hair dresses allows to state that the variants of head dresses and the role which they played in the rite also differed depending on the tradition of a certain region. Wedding dresses of the Poloshuks are distinguished by an unusual originality and local particularities.*